Эффективно работали с молодежью в январе – феврале 1919 года партийные активисты, инструктора, общественность на сборных пунктах Старосельской, Жеребычской волостей Витебского, Войханской, Болецкой Городокского, Бононской, Ефросиньевской Полоцкого, 1, 4 и 5 Лобановской волости Чериковского, местечек Клецк, Погост Слуцкого уезда, 1 – 4 Витебска, 1, 2 Борисова, 1 – 3, 5 Минска [6, лл. 68, 275, л. 189; лл. 83–88; л.159 об.; 16; 1, 78] и других.

Налаживанию военного обучения препятствовали недостаток оружия, финансовых средств на закупку оборудования и снаряжения. Так, на пунктах обучения Барановской, Будницкой, Вязьменской, Ильинской, Маклаковской, Сертейской, Церковищенской волостей Велижского, Бобиничской, Несинской, Тяпинской, Улльской, Ушачской, Черствятской волостей Лепельского уезда в январе 1919 года не имелось исправных винтовок, станков для прицеливания, военного снаряжения и спортивного инвентаря. Изучение оружия происходило по рисункам самодельно сделанных плакатов и некомплектным 3-х линейкам, тактические занятия на пересеченной местности проводились с использованием неисправных или деревянных винтовок. Все это придавало несерьезность процессу обучения, снижало интерес молодых людей к военной подготовке и не позволяло в полном объеме выполнить учебную программу.

В некоторых волостях местные исполкомы самоустранялись от помощи сборным пунктам в проведении агитационно-просветительной работы с населением о необходимости военного обучения, что способствовало уклонению некоторых жителей от обязательных занятий. Например, инспектору Витебского уездного военного комиссариата Соколову при проверке (по итогам января 1919 года) посещаемости населением волостных пунктов всевобуча, военный руководитель Ловжанской волости заявил, что исходя из опыта январского обучения призывников первой очереди, обращаться за помощью в волостной исполком бессмысленно, это только отнимет время и испортит настроение. Воздействовать на пропускавших занятия граждан инструкторам приходилось главным образом угрозами их административного и уголовного наказания [7, лл. 68а., 198, 200, 200об., 202, 204, 206].

Несмотря на имеющиеся проблемы объективного и субъективного характера, непродолжительный срок функционирования, складывающаяся в ССРБ система всеобщего военного обучения молодежи обеспечила в основном потребности Красной армии в обученном резерве. Большинство прошедших систему всевобуча получили хорошие основы военных знаний и успешно защищали территорию Беларуси от польских легионеров в 1919–1920 гг.

**ЛИТЕРАТУРА**


1. Государственный архив Витебской области (ГАВт). – Ф. 1680. Оп. 1. Д. 774; Всеобщее военное обучение. Основы агитации и популяризации идей милиционной системы по 2-му Всероссийскому съезду в Москве: [сб. статей] / Марьясин [и др.]; под ред. Марьясина. Составил: В. Златолинский. – Петербург: Библиотека журнала «Военно-революционная мысль», 1919. – 63 с.
2. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Оп. 1. Д. 3; Д.38.
3. Звезда. 1919. 24 янв.
4. НАРБ. – Ф. 32. Оп. 2. Д. 3; ГАВт. – Ф. 56. Оп. 6. Д. 43; – Ф. 1582. Оп. 1. Д. 203; – Ф. 1680. Оп. 1. Д. 774.
5. ГАВт. – Ф. 1582. Оп. 1. Д. 203; Красноармейская правда. 1922. 11 авг.
6. ГАВт. – Ф. 1582. Оп. 1. Д. 203; Д.202; Государственный архив Могилевской области (ГАМг). – Ф. 232. Оп. 1. Д. 18; НАРБ. – Ф. 32. Оп. 2. Д. 3; Д. 6; Звезда. 1919. 26 февр., 27 февр.
7. ГАВт. – Ф. 1582. Оп. 1. Д. 203.


# ВЫДЗЯЛЕННЕ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ СА СКЛАДУ ССРБ У 1919 Г. (ПАЗІЦЫЯ КІРАЎНІЦТВА ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ, РСФСР І ССРБ)


***Бараноўскі А.В. (г. Мінск, Беларусь)***


1 студзеня 1919 г. у Смаленску быў абвешчаны Маніфест аб утварэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь. Асноўным тэрытарыяльным ядром рэспублікі сталі Віцебская, Гродзенская, Мінская, Магілёўская і Смаленская губерні. Аднак, ССРБ толькі некалькі тыдняў праіснавала у гэтых межах, пакуль Віцебская, Магілёўская і Смаленская губерні не былі выдзеленны з яе складу.

Мэтай даследавання было прасачыць, якія пазіцыі займала кіраўніцтва Віцебскай губерні, РСФСР і ССРБ адносна адміністрацыйнай прыналежнасці тэрыторыі губерні і як гэтыя пазіцыі паўплывалі на ход і вынікі тэрытарыяльнага размежавання паміж Беларуссю і Расіяй.

2 студзеня 1919 г. партыйны камітэт Віцебскай арганізацыі РКП(б) прынцыпова выказаўся супраць стварэння ССРБ [1, арк. 1]. Далейшыя ўзаемаадносіны паміж Віцебскім губвыканкамам і Часовым рабоча-сялянскім урадам Беларусі абмяркоўваліся 9 студзеня на пасяджэнні партыйнага камітэта Віцебскай арганізацыі РКП(б). Старшыня губвыканкама П. Сяргіеўскі, нягледзечы на адмоўнае стаўленне камітэта РКП(б) да ўваходжання ў склад Беларускай рэспублікі, лічыў неабходным падпарадкоўвацца ўраду Беларусі. Пагаджаўся з ім і старшыня Віцебскага камітэта РКП(б) С. Крылоў. Але пры гэтым ён заявіў, што паколькі ў Цэнтры маюцца ваганні адносна адміністрацыйнай прыналежнасці губерні, у Маскву дэлегавана С. Шэйдліна (жонка С. Крылова), якая павінна




Репозиторий ВГУ

там высветліць, ці магчыма губернскаму з’езду Саветаў і партыйнай канферэнцыі ўзняць пытанне супраць стварэння ССРБ [1, арк. 4 аб. – 5].

С. Крылоў быў правы, сапраўды ў Цэтры меліся ваганні адносна тэрытарыяльнага ўладкавання Беларускай рэспублікі, якія вырашыліся 16 студзеня. ЦК РКП(б) на сваім пасяджэнні разгледзеў пытанне аб Беларусі і прыняў наступныя рашэнні: “1) для агульнапалітычнага кіраўніцтва камандзіраваць у Беларусь т. Іофе. 2) даручыць яму правесці праз мясцовыя Саветы, а затым праз з’езд Саветаў Беларусі вылучэнне з Беларускай рэспублікі губерняў Віцебскай, Смаленскай, Мінскай, а ў далейшым, у выпадку магчымасці, і Магілёўскай” [2, арк. 49].

У гэты ж дзень у Віцебску адбыўся агульны сход Віцебскай арганізацыі РКП(б). Віцебскія бальшавікі яшчэ не ведалі пра рашэнні ЦК РКП(б). Абмяркоўваючы даклад аб утварэнні Беларускай рэспублікі, старшыня губернскага Савета народнай гаспадаркі М. Еўсцігнееў заявіў аб магчымасці вылучыць Беларусь у палітычных, але не ў эканамічных адносінах, бо тады прыйдзецца ламаць гаспадарку, а таму з эканамічнага пункту гледжання з Беларускай рэспублікай нельга працаваць [3, арк. 2]. Былы старшыня Рэжыцкага гарвыканкама М. Пяскоўскі адзначыў, што “калі мы гаворым аб выдзяленні Беларускай рэспублікі ў палітычным значэнні, то мы з гэтым згодныя, але калі гаворым і ў эканамічным дачыненні, то гэта для нас з’яўляецца небяспекай” [3, арк. 2 адв.]. Агульны сход самым рашучым чынам выказаўся супраць далучэння да ССРБ. У прынятай пастанове адзначалася: “лічыць неабходным уключэнне Віцебскай губерні назад у склад Расіі, але пры гэтым да вырашэння паўнамоцнымі партыйнымі з’ездамі і канферэнцыямі гэтага пытання, савецкім установам часова падтрымліваць сувязь з беларускім урадам” [3, арк. 3].

20 студзеня з Масквы вярнулася С. Шэйдліна, яна азнаёміла партыйны камітэт з рашэннем Цэнтра аб выдзяленні Віцебскай губерні са сладу ССРБ і далучэнні да РСФСР [1, арк. 8]. Увечары гэтае рашэнне было замацавана ў рэзалюцыі III Віцебскай губернскай партыйнай канферэнцыі. “Стварэнне Беларускай рэспублікі не апраўдваецца ніякімі меркаваннямі. Край ужо даўно русіфікаваны, мовы і нацыянальнай культуры няма. Беларускіх тэндэнцый у шырокіх пралетарскіх і сялянскіх масах не мелася і не маецца. Акрамя таго, ніякімі тактычнымі меркаваннямі гэты крок не можа быць апраўданы” [4].

22 студзеня 1919 г. А. Іофе, як прадстаўнік ЦК РКП(б), прыняў удзел у пасяджэнні ЦБ КП(б)Б, на якім азнаёміў прысутных з прапановай ЦК РКП(б) “абмежаваць памеры Беларускай рэспублікі геаграфічна неабходнымі граніцамі, г.зн. Мінскай і Гродзенскай губернямі” [5, арк. 20 адв.]. Дадзеная прапанова тлумачылася рашэннем ЦК РКП(б) стварыць паміж Савецкай Расіяй і імперыялістычнымі дзяржавамі шэраг буферных рэспублік, якія павінны былі выконваць ролю бар’ера і стрымліваць націск імперыялістаў. Прапанова ЦК РКП(б) не знайшла падтрымкі сярод членаў ЦБ КП(б)Б. Старшыня Цэнтрапалонбежа Р. Найдзёнкаў лічыў, што вяртанне трох губерняў у склад РСФСР нанясе вялікую шкоду справе партыйнай арганізацыі, паколькі ўжо наладжаны ўрадавы апарат. Наркам фінансаў ССРБ І. Рэйнгольд адзначаў: “Прапанову ЦК аб адрэзку ад Беларусі 3-х губерняў нельга назваць удалай, бо яно ў корні разбурае ўвесь тэхнічны і харчовы апарат” [5, арк. 21]. Старшыня ЦБ КП(б)Б А. Мяснікоў заявіў: “спачатку рэспубліка, нягледзячы на пратэсты, была створана, зараз яна расчляняецца” [5, арк. 21]. Абмеркаваўшы даклад А. Іофе, ЦБ КП(б)Б вырашыла фармальна пагадзіцца з прапановай ЦК РКП(б), пакінуўшы за сабой права звярнуцца ў ЦК для яго перагляду.

Неадкладна ў ЦК РКП(б) быў накіраваны ліст у якім члены Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі выступілі супраць вяртання Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў у склад РСФСР. На іх думку, перадача губерняў павінна была змяніць усю палітычную сітуацыю, абапіраючыся на якую магло быць станоўча вырашана беларускае пытанне. Члены беларускага ўрада адзначалі, што пастанова ЦК РКП(б) парушае прынцып свабоднага самавызначэння народаў і “згубна адаб’ецца на жыццёвых інтарэсах беларукага пралетарыяту і сялянства” [2, арк. 54 – 55], у гэтай сувязі яны хадайнічалі аб пераглядзе рашэння ЦК РКП(б).

Адначасова кіраўніцтва ЦБ КП(б)Б накіравала старшыню УЦВК Я. Свярдлову тэлефанаграму з просьбай адмяніць пастанову ЦК РКП(б) аб межах Беларускай рэспублікі, паколькі вылучэнне Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў ЦБ палічыла немэтазгодным. У гэтай сувязі партыйнае кіраўніцтва прасіла Я. Свярдлова паспрыяць другаснаму разгляду пытання аб межах Беларускай рэспублікі [6, арк. 11 – 12]. Аднак у сваім адказе Свярдлоў адзначыў, што “ЦК пацвярджае сваё ранейшае рашэнне, агучанае т. Іофе. ЦК ўпэўнена ў поўным правядзенні ў жыццё яго рашэнняў, выкліканага агульнапалітычнымі меркаваннямі” [7, с. 86].

На пасяджэнні партыйнага камітэта Віцебскай арганізацыі РКП(б) 22 студзеня 1919 г. С. Крылоў праінфармаваў прысутных, што згодна з пастановай Віцебскай губернскай партыйнай канферэнцыі, Віцебская губерня выдзелена са складу Беларускай рэспублікі. Ён адзначыў, што гэта стала магчымым дзякуючы дапамозе кіраўніцтва Цэнтра [1, арк. 9]. Пасля пасяджэння Віцебскі партыйны камітэт РКП(б) накіраваў тэлеграму “Аб выдзяленні са складу ССРБ” у ЦК РКП(б) і ЦБ КП(б)Б [7, с. 80].

IV з’езд Саветаў Віцебскай губерні 26 студзеня 1919 г. пастанавіў вылучыць губерню са склада ССРБ і далучыць да РСФСР. Гэтая пастанова была прынята ў сувязі з тым, што паміж Віцебскай губерняй і Беларускай рэспублікай адсутнічаюць эканамічныя сувязі, а само насельніцтва губерні даўно русіфікаванае [8].

27 студзеня 1919 г. ЦБ КП(б)Б азнаёміла мясцовае кіраўніцтва з рашэннем вылучыць Віцебскую губерню са складу Беларускай рэспублікі. У атрыманай на імя губкама РКП(б) і губвыканкама тэлеграме адзначалася: “ЦБ КП(б)Б, заслухаўшы рэзалюцыю партыйнай канферэнцыі Віцебскай губерні аб неўваходжанні ў склад Беларусі, пастанавіла адмовіцца, як у савецкіх, так і ў партыйных адносінах ад Віцебскай губерні, даўшы апошняй поўную свабоду звязвацца непасрэдна з Цэнтрам ці ўваходзіць у іншае абласное аб’яднанне” [9].



Рэпазіторый ВДУ

27 студзеня 1919 г. ЦБ КП(б)Б на сваім пасяджэнні зноў разгледзела пытанне аб межах Беларусі. Пасля дакладу старшыні ЦБ КП(б)Б А. Мяснікова і абмену меркаваннямі было вырашана для перамоваў аб межах ССРБ дэлегаваць у Маскву Р. Пікеля і І. Рэйнгольда. Пры гэтым беларускія камуністы палічылі магчымым выключыць са складу Беларускай рэспублікі Віцебскую губерню [6, арк. 49].Чарнавы пратакольны запіс тлумачыць чаму было прынята менавіта гэта рашэнне. Старшыня Савета народнай гаспадаркі Р. Пікель падчас выступу адзначыў, што пытанне пра выдзяленне Віцебскай губерні ставяцца рабром, паколькі старшыня Віцебскага губвыканкама П. Сяргіеўскі катэгарычна выказаўся супраць стварэння Беларускай рэспублікі. У гэтай сувязі Р. Пікель лічыў, што "варта адмовіцца ад Віцебскай губерні, бо яна дрань" [10, арк. 41]. Наркам фінансаў І. Рэйнгольд, заявіў: "Віцебская губерня для нас не ўяўляе каштоўнасці ў савецкім дачыненні, але адмаўляцца ад яе не варта" [10, арк. 41]. Пасля далейшага абмеркавання і было вырашана "лічыць магчымым выключыць са складу Беларусі толькі адну Віцебскую губерню" [6, арк. 49]. У атрыманай на імя губкама РКП(б) і губвыканкама тэлеграме адзначалася: "ЦБ КП(б)Б, заслухаўшы рэзалюцыю партыйнай канферэнцыі Віцебскай губерні аб неўваходжанне ў склад Беларусі, пастанавіла адмовіцца, як у савецкіх, так і ў партыйных адносінах ад Віцебскай губерні, даўшы апошняй поўную свабоду звязвацца непасрэдна з Цэнтрам ці ўваходзіць у іншае абласное аб'яднанне" [9, арк. 29].

Вяртанне Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў у склад РСФСР, а таксама зліццё Беларускай і Літоўскай рэспублік было замацавана на І Усебеларускім з'ездзе Саветаў, які праходзіў у Мінску ў пачатку лютага 1919 г.[11].

Такім чынам, кіраўніцтва віцебскіх бальшывікоў былі катэгарычна супраць утварэння ССРБ і ўваходжання ў яе склад Віцебскай губерні. Аднак тут няма нічога дзіўнага, сярод кіраўнікоў губерні пераважалі выхадцы з цэнтральных рэгіёнаў Расіі.Цэнтр адыгрываў велізарную ролю ў эканамічных адносінах для губерні, таму кіраўніцтву Віцебскай губерні былі лепей зразумелыя ўнутраныя сувязі з Масквой і Петраградам, чым з Мінскам.

Што тычыцца кіраўніцтва РСФСР, то яшчэ напярэдадні стварэння Беларускай рэспублікі ў ЦК РКП(б) меўся свой погляд адносна тэрытарыяльнага ўладкавання рэспублікі, які зводзіўся да скарачэння яе тэрыторыі. Польская Рэспубліка прэтэндавала на шэраг беларускіх тэрыторый і адмаўлялася прызнаць ССРБ. Кіраўніцтва РСФСР імкнулася пазбегнуць канфлікту, а таму дапускала магчымасць ахвяры беларускімі землямі, але не ўсёй тэрыторыяй Беларускай рэспублікі, а таму было вырашана вярнуць Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні ў склад РСФСР.

Кіраўніцтва ССРБ было супраць перагляду межаў рэспублікі. Згода ЦБ КП(б)Б на вяртанне Віцебскай губерні ў склад РСФСР тлумачыцца тым, што кіраўніцтва Віцебскага губкама РКП(б) выступіла катэгарычна супраць стварэння Беларускай рэспублікі і ўваходжання ў яе склад.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей – ДАВВ). – Ф. 10050-п. Воп. 1. Спр. 27.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 478.
3. ДАВВ. – Ф. 10050-п. Воп. 1. Спр. 24.
4. ДАВВ. – Ф. 10069-п. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 66.
5. НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 8.
6. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 498.
7. Государственные границы Беларуси : сб. документов и материалов. В 2 т. – Т. 1. (март 1917 – ноябрь 1926) / сост. : В. Е. Снапковский [и др.]. – Минск : БГУ, 2012. – 495 с.
8. ДАВВ. – Ф. 1821. Воп. 1. Спр. 309.
9. НАРБ. – Ф. 4. Воп. 1. Спр. 27. Арк. 29.
10. НАРБ. – Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 38.
11. Звезда. – 1919. – 4, 5 февр.


# РЕАЛИЗАЦИЯ ПОЛИТИКИ «ВОЕННОГО КОММУНИЗМА» В УСЛОВИЯХ КРЕСТЬЯНСКОЙ РЕВОЛЮЦИИ В УКРАИНЕ (1919–1921 ГГ.)


***Корновенко С.В. (г. Черкассы, Украина)***


1917 – 1921 гг. – непродолжительный отрезок времени, насыщенный судьбоносными событиями, которые кардинально изменили судьбы многих европейских народов. Прежде всего речь идет о революциях, прервавших многовековую историю континентальных империй и активизировавших национально-государственное строительство славянских народов. В частности, для Украины своеобразным «Рубиконом» стала Украинская революция.

Анализ современной украинской и зарубежной историографии позволяет убедительно говорить о том, что феномен Украинской революции 1917 – 1921 гг. стал объектом пристального научного изучения [9, с. 146 – 154; 20, с. 27 – 36; 21; 22; 23; 24; 27]. Считаем справедливым определять Украинскую революцию 1917 – 1921 гг. как многомерное, целостное историческое и социокультурное явление, наиболее активным субъектом которого было крестьянство. Это дает нам основания говорить о крестьянском характере Украинской революции [6; 7; 5]. В то же время это не противоречит тому, что Украинская революция – национально-демократическая.



Репозиторий ВГУ